*Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

**Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна**

№ 5 (283) | Аўторак, 12 лютага 1957 года | Цана 20 кап.



*Зіна Шалупенка працуе ў чытальнай зале нашага ўніверсітэта. Адначасова яна займаецца на завочным аддзяленні філалагічнага факультэта.*

*На днях Зіна паспяхова здала экзамен па гісторыі філасофіі—у яе заліковай кніжцы з'явілася яшчэ адна адзнака—«добра». Цяпер трэба здаць экзамен па савецкай літаратуры, а тады—прыступіць да напісання дыпломнай работы.*

## СЕСІЯ ЗАВОЧНІКАЎ

На завочным факультэце зараз адказны перыяд. Пачалася зімняя экзаменацыйная сесія.

Нямала цяжкасцей даводзіцца сустрэць і пераадолець завочніку, пакуль ён атрымае вышэйшую адукацыю. Вучоба завочніка адрозніваецца ад вучобы студэнта стацыянара. Вечарамі, стомлены дзённай працай на заводзе, у школе, рэдакцыі, ці іншай установе або на прадпрыемстве, студэнт-завочнік садзіцца за кнігу—да поўначы чытае літаратуру, піша дыпломную або курсавую работу. І толькі два разы у год ён прыязджае ва універсітэт на сесію, дзе выкладчыкі выяўляюць, наколькі яго веды адпавядаюць праграмным патрабаванням. Такім чынам для таго, каб паспяхова займацца на завочным факультэце, трэба мець не толькі цягу да ведаў, не толькі здольнасці, але і ўпартасць, настойлівасць, жаданне перамагчы усе цяжкасці і глыбока авалодаць ведамі.

А як радасна звяртацца з сесіі з добрымі і выдатнымі адзнакамі ў заліковай кніжцы! Атрымаць-жа іх можа толькі той, хто настойліва займаўся на працягу ўсяго межсесійнага перыяду, хто выкарыстаў усю патрэбную літаратуру, пазнаёміўся з дадатковымі творамі і глыбока разабраўся ў вывучаемым матэрыяле.

Але часта здараецца і адваротнае. Многія завочнікі нічога не робяць дома ў надзеі падрыхтавацца да экзамена за тры-чатыры дні, якія даюцца на падрыхтоўку ў час сесіі, і атрымаць хоць «здавальняюча». «Навошта болей?»—тлумачаць многія студэнты-завочнікі, хоць самі добра разумеюць усю шкоднасць такой пастаноўкі пытання.

У час сесіі экзаменатары хутка разгледзяць, хто са студэнтаў прышоў здаваць экзамены добра падрыхтаваным, а хто спадзяецца на «авось». Зараз патрабаванні да усіх студэнтаў—як стацыянара, так і завочнага аддзялення—сталі больш павышанымі. Выкладчыкі не праяўляюць таго лібералізму, які меў месца ў час мінулых сесій у асобных выпадках. Экзаменатары пытаюць студэнтаў у поўным аб'ёме універсітэцкага курса і ацэньваюць веды той адзнакай, якую аб'ектыўна заслужыў студэнт.

Зразумела, строгі падыход пры ацэнцы ведаў завочніка не павінен прывесці да другой крайнасці—да незаслужанага зніжэння адзнак. Тут выкладчыкі павінны быць асабліва ўважлівымі. Трэба памятаць, што завочнік вымушан займацца ў іншых умовах у параўнанні са студэнтам стацыянара, што далёка не кожны мае вучэбную і дапаможную літаратуру. А атрымаць кансультацыю па незразумеламу пытанню можа толькі той, хто жыве ў Мінску або яго ваколіцах.

У сувязі з гэтым, трэба сказаць аб лекцыях, якія чытаюцца завочнікам. Далёка не ўсе з іх могуць задаволіць слухачоў. Звычайна курс прадмета у 3—4 разы карацей, чым на стацыянары. Гэта абавязвае выкладчыкаў даваць самае галоўнае з курса, асноўныя тэарэтычныя палажэнні. На справе часта атрымліваецца так, што лектар знаёміць студэнтаў толькі з асобнымі раздзеламі таго курса, які ён чытаў для студэнтаў стацыянара. Гэта прыводзіць да таго, што ў канспектах завочнікаў выпадаюць цэлыя раздзелы, шэраг пытанняў застаецца не высветленымі. І нярэдка ў час экзаменаў студэнт-завочнік выказвае шчырае здзіўленне, што ў экзаменацыйных білетах ёсць пытанні, з якімі іх ніхто не знаёміў. Такую няправільную практыку ў чытанні лекцый завочнікам асобнымі выкладчыкамі трэба спыніць.

Сур'ёзныя патрабаванні неабходна прад'явіць і да дэканата завочнага факультэта. Вельмі часта іх сувязь з завочнікамі ажыццяўляецца вельмі фармальна, без уліку сапраўдных запатрабаванняў студэнтаў. Так, са спазненнем атрымліваюць завочнікі заданні па кантрольных і курсавых работах, падоўгу не атрымліваюць рэцэнзіі на выкананыя кантрольныя і курсавыя работы. Бываюць выпадкі, калі метадычныя указанні праграмы студэнт-завочнік атрымлівае таксама са спазненнем. Дэканат не змог патрабаваць ад усіх выкладчыкаў добрай якасці рэцэнзіравання, у выніку многія рэцэнзіі не маюць патрэбнага аналізу курсавых, кантрольных або дыпломных работ, а указваюць толькі, залічана работа ці не.

Недастатковыя меры прымаюць работнікі дэканата і да тых студэнтаў, якія займаюцца не 6 год, як паложана па праграме, а па 8—10.

Цяпер, калі да завочнага аддзялення прад'яўлены асабліва высокія патрабаванні, калі завочныя факультэты павінны рыхтаваць сапраўды высокакваліфікаваных спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, трэба зрабіць усё магчымае, каб студэнты набылі тут глыбокія веды, і, атрымаўшы дыплом БДУ, сталі добрымі настаўнікамі, літаратарамі, гісторыкамі, матэматыкамі, біёлагамі.

# АБ ВЫНІКАХ ЭКЗАМЕНАЎ НАМ ПАВЕДАМІЛІ:

* * *

## Патрэбна зрабіць глыбокі аналіз

Мы звярнуліся да дэканаў некалькіх факультэтаў з просьбай расказаць аб некаторых выніках экзаменацыйнай сесіі на факультэтах.

— Гэтая сесія навучыла нас многаму,—гаворыць дэкан біёлага-глебавага факультэта П. Г. Пятровіч. Нягледзячы на тое, што вынікі сесіі на біёлага-глебавым факультэце ў параўнанні з некаторымі іншымі факультэтамі значна ніжэй, вынікамі яе мы задаволены. Больш высокія патрабаванні да студэнтаў паказалі, што гэта прыносіць вялікую карысць як студэнтам, так і выкладчыкам. Прад'яўляючы высокія патрабаванні да студэнтаў, мы тым самым прымушаем іх больш працаваць, не хапаць вярхі з вывучаемых прадметаў, а глыбока аналізаваць тое ці іншае пытанне, дасканальна разбірацца ў фактычным матэрыяле. Разам з тым, многа патрабуючы ад студэнтаў, мы тым самым прымушаем выкладчыкаў чытаць лекцыі толькі на высокім тэарэтычным узроўні. Тых-жа выкладчыкаў, якія не могуць задаволіць нашых патрабаванняў, мы замяняем больш кваліфікаванымі, вопытнымі.

Сесія паказала, што ўсе экзаменатары павінны прад'яўляць аднолькавыя патрабаванні, ні адзін з выкладчыкаў не мае права лібералнічаць, таму што тым самым наносіць вялікую шкоду студэнту.

У час сесіі выявіліся студэнты, якія не здольныя займацца ў ВНУ. Гэта Івашка, Казакевіч (II курс), якія не маглі здаць ні аднаго экзамена нават на «здавальняюча».

Разам з тым, трэба адзначыць, што калі на курсе ёсць некалькі здавальняючых або нездавальняючых адзнак, гэта ні ў якім разе не гаворыць аб дрэнным рабоце выкладчыка, а сведчыць аб тым, што студэнты дрэнна папрацавалі на працягу семестра, і іх веды не адпавядаюць пастаўленым патрабаванням.

Станоўчай з'явай на факультэце трэба адзначыць і тое, што ні адзін з «праваліўшыхся» на экзаменах студэнтаў не атрымаў дазволу на пераздачу экзамена. Гэта навучыць студэнтаў з першага разу ісці на экзамен з глыбокімі ведамі, а не спадзявацца, што ў выпадку праваду можна будзе здаць у другі раз.

Нельга абыйсці і нашых выдатнікаў. Факультэт ганарыцца такімі студэнтамі, як Кручкова, Шкляроў, Шушкіна (1 курс), Ільіна, Сіляева (III курс), Падутаў (IV курс), Башэева, Падута, Зюліна, Хадарэнка (V курс) і многімі іншымі.

## МЫ ЗАДАВОЛЕНЫ

— Вынікамі сесіі мы задаволены,—гаворыць дэкан філалагічнага факультэта М. Г. Ларчанка. Па маіх назіраннях, сесія на філалагічным факультэце прайшла на высокім тэарэтычным і навуковым узроўні.

Аб тым, што ў гэтую сесію да студэнтаў будуць прад'яўлены больш высокія патрабаванні, яны былі папярэджаны загадзя. Таму і рыхтаваліся да сесіі больш настойліва і сур'ёзна.

Задоўга да сесіі кафедрамі факультэта былі распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы аб вызваленні часу для самастойнай работы студэнтаў. У групах абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі да сесіі. Усё гэта дало станоўчыя вынікі.

Сесія паказала, што ў гэтым годзе ўзрасла колькасць здавальняючых адзнак. У сувязі з інструкцыяй Міністэрства вышэйшай асветы аб новым парадку назначэння стыпендый, выкладчыкі больш аб'ектыўна падыходзілі да ацэнкі ведаў студэнтаў. Таму «здавальняюча» займае даволі значнае месца ў экзаменацыйнай ведамасці. У сувязі з павышанымі патрабаваннямі, паменшылася колькасць выдатных адзнак.

Як недахоп, трэба адзначыць, што ўсё яшчэ адчуваецца ўплыў мінулых сесій як сярод выкладчыкаў, так і студэнтаў. Некаторыя экзаменатары ўсё яшчэ лібералнічаюць, завышаюць адзнакі студэнтам.

*

## Што паказалі экзамены на юрфаку

*Некалькі дзён назад закончыліся экзамены на юрыдычным факультэце. Вынікі сесіі паказалі як станоўчыя бакі, так і недахопы ў падрыхтоўцы да яе. Агульным недахопам з'яўляецца тое, што ў працэсе падрыхтоўкі да сесіі многія студэнты карыстаюцца вучэбнікам або канспектам і зусім не заглядваюць у дадаткова рэкамендаваную літаратуру. Зразумела, што за 2—3 дні нельга перачытаць усе першакрыніцы. А калі-б у студэнта быў канспект гэтых першакрыніц, ён меў-бы магчымасць хутчэй і лепш падрыхтавацца да экзаменаў. Адсюль вынік—студэнты на працягу ўсяго семестра павінны самастойна працаваць над кнігай, больш чытаць дапаможнай літаратуры.*

*Вынікі экзаменаў паказалі, што на 3 курсе экзамены прайшлі значна лепш, чым на ўсіх астатніх. Тут многа выдатнікаў (Алёхін, Шабайлаў, Шынгель, Броўка, Левы, Серафімовіч і іншыя), менш здавальняючых адзнак.*

*На 2 курсе вынікі значна ніжэй. Некаторыя студэнты атрымалі нават нездавальняючыя адзнакі. Гэта Сучок і іншыя.*

*Трэба спыніцца больш падрабязна на выніках экзаменаў на 1 курсе. Увогуле курс падрыхтаваўся да экзаменаў дрэнна. Гэта тлумачыцца несур'ёзнымі адносінамі да вучобы з боку большасці студэнтаў курса. І нягледзячы на тое, што на падрыхтоўку да экзаменаў першакурснікам давалася больш часу, чым студэнтам другіх курсаў, вынікі тут значна ніжэй. Гэта сведчыць аб тым, што да экзаменаў трэба рыхтавацца не толькі ў тыя некалькі дзён, якія адводзяцца на падрыхтоўку да іх, а на працягу ўсяго семестра. У гэтым, відавочна, добра упэўніліся студэнты Седзенка, Скапцова, Швырова, Кучаравенка, Малышава, Арлова, Зенкевіч, Іваноў, Кавалёў і іншыя, калі ў экзаменацыйнай ведамасці супроць іх прозвішчаў выкладчык ставіў «нездавальняюча».*

*Трэба дадаць, што многія першакурснікі не дапушчаны да экзаменаў зусім. Гэта студэнты Енін, Капленка, Піrожны, Баленда, Шахновіч, Гольдберг, Міцічава і іншыя.*

*Многія студэнты спадзяюцца на «міласць» выкладчыкаў. У некаторых выпадках яны не памыляюцца. Выкладчык праяўляе лібералізм, і гультай атрымоўвае добрую адзнаку.*

*Гэтыя студэнты павінны сур'ёзна задумацца над стварыўшымся становішчам. І няхай яны не думаюць, што іх нездавальняючыя адзнакі—вынік адмоўных адносін да студэнтаў з боку выкладчыкаў.*

*Грамадскія арганізацыі і выкладчыкі факультэта павінны самым сур'ёзным чынам абмеркаваць вынікі сесіі і прыняць дзейсныя меры, каб падобных з'яў не паўтарылася ў наступныя экзаменацыйныя сесіі. Адносна-ж студэнтаў-гультаёў будзем спадзявацца, што дэканат факультэта пасапраўднаму зоймецца гэтымі таварышамі.*

**Калектыўны карэспандэнт «Беларускага універсітэта» рэдакцыя насценгазеты «Совецкі юрыст».**

